# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*2023 год*

Ліст да дзесяцікласнікаў Беларусі Inbox ×

M

Шаноўны дзесяцікласнік!
Мяне завуць Марыя. Я жыву далёка ад Беларусі, але хачу пазнаёміцца з тваёй краінай. Прачытала што ў Беларусі шмат рэк і азёр, чыстыя лясы і гаі. А яшчэ твая краіна мае багатую і цікавую гісторыю і мову. Я пачала спецыяльна вывучаць беларускую мову і літаратуру. Некаторыя пытанні для мяне застаюцца складанымі, таму прашу дапамогі. Упэўнена, што ты зможаш гэта зрабіць!

--
З павагай,
Марыя

*Сёння мы разам з вамі зробім падарожжа ў свет беларускай мовы і літаратуры разам з Марыяй, пазнаёміўшы яе з некаторымі асаблівасцямі беларускай мовы і гранямі беларускага мастацкага слова.*

## 10 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.** Першы наш прыпынак – краіна Лексікалогія. Тут шмат розных “жыхароў”, сярод іх ёсць амаформы – гэта розныя па значэнні словы, якія супадаюць у пэўнай граматычнай форме. Часта гэта словы розных часцін мовы (*вусны адказ – прыгожыя вусны*), радзей – адной (*лячу ў самалёце – лячу дзяцей*). Дапамажыце Марку размежаваць наступныя словы (словаформы), праілюстраваўшы іх магчымыя значэнні адпаведным кантэкстам. Назавіце часціну мовы, да якой яны адносяцца, і зрабіце іх графічны падзел на марфемы.

*Максімальная колькасць балаў* – ***6***.

*Праліў – праліў*; *тром – тром*; *замок – замок*; *апёк – апёк*.

| **Часціны мовы, да якіх належаць амаформы** | **Словазлучэнні (сказы), якія ілюструюць лексічнае значэнне амаформаў** | **Падзел слова на марфемы** |
|---|---|---|
| *праліў –* | | |
| *праліў –* | | |
| | | |
| *тром –* | | |
| *тром –* | | |
| | | |
| *замок –* | | |
| *замок –* | | |
| | | |
| *апёк –* | | |
| *апёк –* | | |

**Заданне 2.** У Фразеаландыі, як і ў іншых экзатычных краінах, звычайныя рэчы (словы) часта паўстаюць у вельмі нечаканых і непрадказальных праявах і незвычайна паводзяць сябе, бо вельмі цесна звязаны з жывой народнай традыцыяй, з невычэрпнай людской фантазіяй.

Паспрабуйце зарыентавацца “на мясцовасці” і вызначыце, які кампанент прапушчаны ў кожным з прыведзеных фразеалагізмаў. Выберыце гэты кампанент з прапанаваных у трэцім слупку. Насупраць абранага кампанента пастаўце ў чацвёртым слупку знак “+”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| **Фразеалагізм** | **Значэнне** | **Кампанент** | **+** |
|---|---|---|---|
| *танцаваць ад ...* | ‘пачынаць з самага прывычнага, паўтараючы ўсе дзеянні з самага пачатку’ | *парога* | |
| | | *дзвярэй* | |
| | | *акна* | |
| | | *печы* | |
| | | *прыпечка* | |
| | | | |
| *... рубель* | ‘вялікі, але лёгкі заробак’ | *залаты* | |
| | | *доўгі* | |
| | | *кароткі* | |
| | | *важкі* | |
| | | *лёгкі* | |
| | | | |
| *падвесці пад ...* | ‘хітрасцю, падманам ставіць каго-н. у цяжкае, непрыемнае становішча’ | *турму* | |
| | | *царкву* | |
| | | *манастыр* | |
| | | *сцяну* | |
| | | *мур* | |
| | | | |
| *аж ... шуміць* | ‘лепей, мацней быць не можа’ | *пушча* | |
| | | *дуброва* | |
| | | *лес* | |
| | | *бор* | |
| | | *гай* | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *стаяць на адной ...* | ‘займаць аднолькавае становішча, быць роўным у якіх-н. адносінах’ | *назе* | |
| | | *дошцы* | |
| | | *прыступцы* | |
| | | *лесвіцы* | |
| | | *пасадзе* | |
| *... у (ў) галаве* | ‘хто-н. бесталковы, някемлівы’ | *мякіна* | |
| | | *каша* | |
| | | *вецер* | |
| | | *пустата* | |
| | | *дурасць* | |

**Заданне 3.** Кожны дасведчаны турыст ведае, што любая вандроўка павінна быць дакладна спланавана і падчас яе трэба строга прытрымлівацца правіл, інакш можна сутыкнуцца з небяспечнымі наступствамі. Але шмат каго прываблівае і непрадказальнасць у вандроўках, магчымасць час ад часу прымаць рашэнні, звязаныя з выбарам таго ці іншага варыянта маршруту.

Гэтаксама і з мовай. З аднаго боку, яна заснавана на дакладных правілах, якія трэба строга выконваць. А з другога – у адных і тых жа выпадках мова часам дазваляе зрабіць выбар у адпаведнасці з нашымі прыхільнасцямі, адчуваннем гармоніі маўлення.

Напрыклад, некаторыя назоўнікі ў тым ці іншым склоне і ліку могуць ужывацца не з адным, а з двумаканчаткамі як варыянтнымі, якія дапускаюцца нормай літаратурнай мовы.

Адчуйце сябе падарожнікам па мове і знайдзіце такія словы ў прыведзенай табліцы. Запішыце дапушчальныя іх граматычныя формы для адпаведных склону і ліку. Насупраць астатніх слоў пастаўце прочыркі.

***Прыклад:***

| Склон і лік | Слова | Граматычныя формы |
|---|---|---|
| Родны, множны | *Секунда* | *секунд / секундаў* |
| Родны, множны | *Стол* | – |

*Максімальная колькасць балаў –* ***6.***

| **Склон і лік** | **Слова** | **Граматычныя формы** |
|---|---|---|
| Родны, множны | *з’ява* | |
| Родны, множны | *далонь* | |
| Месны, адзіночны | *гай* | |
| Творны | *грудзі* | |
| Родны, множны | *вясна* | |
| Месны, адзіночны | *бераг* | |

**Заданне 4.** Кожнай часціне мовы ўласцівы свой набор граматычных і лексіка-граматычных катэгорый, прычым гэтым наборам ахопліваецца абсалютная большасць слоў пэўнай часціны мовы. Усё гэта значна ўскладняе засваенне любой мовы як замежнай.

*__Цікава!__ Склад часцін мовы ў розных мовах неаднолькавы. Адрозненні тычацца як аб'ёму асобных часцін мовы, так і ўсяго іх набору. Напрыклад, у сучаснай арабскай мове некаторыя мовазнаўцы вылучаюць усяго толькі тры часціны мовы (імя, дзеяслоў, часціцу).*

Дапамажыце Марыі зарыентавацца ў Граматыцы. Марыя дапусціла некаторыя памылкі як у вызначэнні часцінамоўнай прыналежнасці вылучаных слоў, так і пры іх лексіка-граматычным і ўласна граматычным апісанні. Выпраўце, дзе гэта неабходна, памылкі і патлумачце, чаму меркаванне Марыі было памылковым.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Па-першае, чаму "Беларусь"? Ёсць ***некалькі***[1] варыянтаў паходжання гэтай назвы. Прывяду два з іх.

***Першы***[2]: белае ***адзенне***[3] даўніх вясковых людзей, белыя іхнія валасы, белы колер скуры.

Другі. А ён аніяк не супярэчыць з першым. ***Калі***[4] на нашы старажытныя славянскія землі прыйшлі татара-манголы – здолелі адбіцца ад іх адны толькі мы.

І ***менавіта***[5] таму мы "белая", "чыстая ад нашэсця татараў" Русь. А гэта да шмат чаго абавязвае. І вы заўсёды ***памятайце***[6] гэта (*У. Караткевіч*).

| **Слова з тэксту** | **Лексіка-граматычная і граматычная характарыстыка** | **Выпраўленне памылкі (пры яе наяўнасці)** | **Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці)** |
|---|---|---|---|
| *некалькі*[1] | Прыслоўе: акалічнаснае меры і ступені | | |
| *першы*[2] | Прыметнік: якасны, поўны | | |
| *адзенне*[3] | Назоўнік: ІІ скланення, у форме множнага ліку | | |
| *калі*[4] | Прыслоўе: акалічнаснае часу, невытворнае | | |
| *менавіта*[5] | Часціца: сэнсавая, узмацняльная | | |
| *памятайце*[6] | Дзеяслоў: пераходны, у форме будучага часу | | |

**Заданне 5.** Падарожнічаць могуць не толькі людзі, але і словы! Многія словы вандруюць з мовы ў мову шмат стагоддзяў, па дарозе змяняючы сваё аблічча і прыходзячы ў новы дом-слоўнік амаль непазнавальнымі.

Прачытайце слоўнікавыя артыкулы з розных слоўнікаў, назавіце тып кожнага слоўніка. Уявіце сабе, што ўсе гэтыя артыкулы змешчаны ў адным слоўніку. Якую агульную лінгвістычную задачу магла б вырашаць такая лексікаграфічная крыніца?

*Максімальная колькасць балаў – **5**.*

| **Слоўнікавы артыкул** | **З якога слоўніка ўзяты артыкул?** |
|---|---|
| АДЭКАЛОН. Спіртавы раствор розных пахучых рэчываў, які выкарыстоўваецца як парфумерны сродак. | |
| АДЭКАЛОН. Запаз. у XIX ст. з франц. м., дзе *eau de Cologne з’*яўляецца ўстойлівым словазлучэннем “вада з Кёльна”, “кёльнская вада”. | |
| АДЭКАЛОН. Слова ўтворана са складнікаў *eau* (вада), *de* (прыназоўнік роднага склону), *Cologne* (Кёльн); *невытв.*; адэкалончык, адэкалонны, адэкалоніць, адэкалоніцца, наадэкалоніцца. | |
| АДЭКАЛО́Н м. НВ адэкало́н, РД адэкало́ну, адэкало́нам, адэкало́не; мн. НВ адэкало́ны, адэкало́наў, адэкало́нам, адэкало́намі, адэкало́нах. | |

Агульная задача:

______________________________________________________________

**Заданне 6.** Наступны прыпынак нашага падарожжа – Пунктуацыя. Уявіце, што існуе формула для вылічэння колькасці косак пры аднародных членах сказа:

$$x = n - 1,$$

дзе $x$ – колькасць косак, а $n$ – колькасць аднародных членаў.

Рашыце задачу:

Прапанаваны схемы сказаў з аднароднымі членамі без косак. Для якіх сказаў гэта формула правільная?

*Максімальная колькасць балаў – **7.***

1. […і ○ і ○ і ○ і ○…].
2. […не ○○○ а ○…].
3. […○ і ○○ і ○…].
4. […○○○○…].
5. […○○○ ці ○…].
6. […і ○ і ○ і ○ або ○…].
7. […○ або ○○○…].

Формула правільная для сказаў (*адзначце нумары*) ____________________

**Заданне 7.** Калі вы заўзяты турыст і прыхільнік здаровага ладу жыцця, вам будзе значна прасцей перакласці прапанаваны тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Приключенческий (экстремальный) туризм связан с большими физическими нагрузками и эмоциональным напряжением, с риском и приключениями. Он представляет собой своеобразный способ отдыха в особо привлекательных и не тронутых хозяйственным освоением местах с занятием необычными и рискованными видами деятельности. Приключенческие туры относятся к разряду элитарного отдыха. Подобные путешествия требуют значительных затрат, тем не менее спрос на них неуклонно растет *(Из научной статьи).*

**Заданне 8.** Працягваем наша падарожжа. Патлумачце Марыі некаторыя літаратуразнаўчыя паняцці і падбярыце да гэтых паняццяў прыклады з прапанаваных. У табліцу ўпішыце нумары ўсіх прыкладаў у патрэбныя ячэйкі.

*Максімальная колькасць балаў – **5.***

| | |
|---|---|
| 1.<br>Як кавалак чорнага хлеба,<br>Як блакітнае, чыстае неба,<br>Як кропля вады і паветра,<br>Як дарога ў сто кіламетраў,<br>Як сонца ў пазалоце,<br>Як крылы арлу ў палёце,<br>Як ранняй вясны абнова, –<br>Так родная бацькава мова<br>Патрэбна мне.<br>*Мечыслаў Шаховіч* | 2.<br>Нам разам трыццаць. Мы стаім на кладцы.<br>Яна свавольна туфелькі зняла,<br>Падаўшы мне далонь, каб не сарвацца,<br>Сцюдзёнай хваляй ногі абдала.<br>Пасля... Пасля: “Шчаслíва заставацца!”<br>І без мяне да берага пайшла.<br>На белай кладцы мокрыя слядкі –<br>Як першай песні мілыя радкі.<br>*Ніл Гілевіч* |
| 3.<br>Услала пажоўклае лісце дарогі,<br>Буслам ужо Афрыка цёплая сніцца.<br>І раптам прыйшла, прыпазніўшыся трохі,<br>Да нас навальніца.<br>*Пімен Панчанка* | 4.<br>Сярод зімы сняжыстай,<br>Сярод вясны вятрыстай<br>Я вырасла, каб сэрцам<br>Адчуць цяпло зямлі…<br>*Яўгенія Янішчыц* |
| 5.<br>“Ну, як на чужыне жывецца?”<br>“Цудоўна!” – смяюцца яны…<br>А сэрцы, стамлёныя сэрцы,<br>Адстукваюць “SOS” – без маны.<br>*Янка Сіпакоў* | 6.<br>Сатрэ той пошуг агнявы<br>Прывід жыцця перад вачыма.<br>І смерць уступіць у правы.<br>У тое верыць ці магчыма?!<br>*Мікола Мятліцкі* |

| ***Тэрмін*** | ***Азначэнне тэрміна*** | ***Нумары прыкладаў*** |
|---|---|---|
| Амфібрахій | | |
| Актава | | |
| Рытарычнае пытанне | | |
| Анафара | | |

**Заданне 9.** Дапамажыце Марыі вызначыць праўдзівыя і непраўдзівыя сцверджанні. Насупраць праўдзівых пастаўце знак “+”.

*Максімальная колькасць балаў – **7.***

| **Сцверджанне** | **Праўдзівае/ непраўдзівае** |
|---|---|
| “Песня пра зубра” Міколы Гусоўскага была напісана ў XVI ст. | |
| Большасць даследчыкаў сёння прыпісвае аўтарства паэмы “Тарас на Парнасе” Канстанціну Вераніцыну | |
| Пяру Яна Чачота належаць наступныя вершы “Покуль сонца ўзыдзе…”, “Мая дудка”, “Пад мачтай” | |
| Янка Купала быў рэдактарам газеты “Наша доля” | |
| Цётка – адна з пачынальніц жанру дарожнага эсэ ў беларускай літаратуры XX ст. | |

| | |
|---|---|
| Помнік Янку Купалу пастаўлены ў Нью-Ёрку | |
| Дзеянне паэмы “Бандароўна” Янкі Купалы адбываецца на тэрыторыі Расіі | |
| Якуб Колас вядомы як паэт і празаік | |
| Максім Гарэцкі нарадзіўся на Міншчыне | |
| Большасць дзейных асоб апавядання “Роднае карэнне” Максіма Гарэцкага мелі рэальных прататыпаў | |
| Галоўным героем апавядання “На пыльнай дарозе” Кузьмы Чорнага з’яўляецца дванаццацігадовы падлетак | |
| У цэнтры ўвагі аповесці “Жураўліны крык” Васіля Быкава лёс шасці чалавек, якіх звязала вайна | |
| Уладзімір Караткевіч ніколі не пісаў п’ес | |
| Яўгенія Янішчыц з’яўляецца аўтарам наступных радкоў:<br>…Любоў мая, ты песня, і маркота,<br>І спелы бор, і вольны гон ракі | |

**Заданне 10.** Сёлета Марыя збіраецца наведаць Беларусь, каб пабываць у яе культурнай сталіцы гэтага года – слаўным горадзе Слуцку. А яшчэ яна збіраецца наведаць мясціны, звязаныя з жыццём і/або творчасцю свайго любімага беларускага пісьменніка.

Гэта аўтар наступных радкоў:

*Мой родны кут, як ты мне мілы!..*
*Забыць цябе не маю сілы!*
*Не раз, утомлены дарогай,*
*Жыццём вясны мае убогай,*
*К табе я ў думках залятаю*
*І там душою спачываю.*

Літаратурны псеўданім гэтага пісьменніка цесна звязаны з хлебам і роднай зямлёй. Гэтым самым ён падкрэсліваў знітаванасць сваёй творчасці з жыццём народа.

**Назавіце гэтага пісьменніка.**

**Складзіце для Марыі турыстычны маршрут, які павінен уключаць тры мясціны Беларусі, звязаныя з жыццём і/або творчасцю названага пісьменніка, а таксама ўкажыце, што там трэба абавязкова паглядзець.**

**Напішыце невялікі рэкламны тэкст экскурсіі, каб вашы аднагодкі захацелі таксама праехаць гэтым маршрутам. Звярніце ўвагу, што тэкст павінен быць адрасным.**

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Пісьменнік:* ____________________________________________

*Экскурсійны маршрут*

| ***Месца*** | ***Што абавязкова трэба паглядзець*** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

*Рэклама*

_______________________________________________________________